Агучваннне таго задання, да якога мы звярталіся ў пачатку ўрока (1–2 узровень).

3 узровень — практыкаванне 151, § 20.

4 узровень — практыкаванне 151, лінгвістычнае паведамленне па тэме "Сказ. Працяжнік паміж дзейнікам і выказнікам".

**XI. Рэфлексія.**

***Слова настаўніка.*** Наш урок хачу закончыць радкамі з верша Рыгора Барадуліна:

*У акіяне слоў — ані мяжы, ні донца.*
*Ёсць там адна аснова:*
*Праца і праца бясконца!*

Няхай гэтыя словы стануць дэвізам у вашай вучобе.

Якім быў настрой на сённяшнім уроку?

Дзякуй за працу.

*Дата поступления в редакцию: 29.06.2023*

# ПЛАН-КАНСПЕКТ ПАЗНАВАЛЬНАГА ЗАНЯТКА "У КОЖНАЙ ПЕЧЫ СВОЙ КУЛІЧ"

*Шкурко Раіса Міхайлаўна*

**Мэта:** абуджэнне цікавасці у дзяцей да праваслаўных хрысціянскіх традыцый святкавання Светлага Вялікадня і далучэнне да традыцый свайго народа.

**Задачы:**

пазнаёміць дзяцей з праваслаўным святам Вялікдзень, з народнымі традыцыямі і звычаямі праваслаўнай культуры;

стварыць уласныя мастацкія працы;

развіццё духоўна-маральнага патэнцыялу навучэнцаў, творчых здольнасцей, мастацкага густу;

фарміраванне камунікатыўных кампетэнцый;

выхаванне павагі да народнай культуры свайго народа, праваслаўнай гісторыі;

стварэнне спрыяльнай эмацыйнай атмасферы на занятку; даставіць дзецям радасць, задавальненне.

**Матэрыялы і абсталяванне:** ручнікі, абрус, кошык з чырвонымі яйкамі, галінкі вярбы, наўтбук, ілюстрацыі кулічоў; шаблоны для творчай працы навучэнцаў; каляровыя самаклейная папера і кардон, клей-аловак, нажніцы, просты аловак.

**Ход занятка**

*Група ўпрыгожана ручнікамі, выявамі кулічоў, велікодных яек, стол засланы абрусам.*

*Гучыць музыка. Уваходзіць у групу педагог у ролі бабулі, апрануты ў народны касцюм, у руках кошык, у якім чырвоныя яйкі, галінкі вярбы.*

**I. Арганізацыйны момант.**

Добры дзень, мае даражэнькія, і дарослыя, і маленькія! Я так спяшалася да вас, бо ў мяне да вас вельмі цікавая размова. Вы гатовы мяне слухаць і мне дапамагаць? Тады ўсміхніцеся хутчэй і ўсім нам будзе весялей.

**II. Вызначэнне тэмы занятка.**

Сёння я хачу з вамі пагаварыць пра традыцыі і звычаі нашых продкаў, як яны адпачывалі, як святы святкавалі.

А якія святы вы ведаеце? *(Адказы дзяцей).*

Паглядзіце ў мой кошык. *(Дзеці заглядваюць у кошык).* Можа, па прадметах, якія ў ім знаходзяцца вы даведаецеся, пра якое свята мы будзем гаварыць? *(Адказы дзяцей).*

Сапраўды, сёння мы пагаворым пра свята свят – Вялікдзень. Як і ўсе праваслаўныя святы, Вялікдзень багаты на абрады і традыцыі. Сёння мы даведаемся, як да яго рыхтаваліся даўней, як праводзілі, як гулялі, як гасцей частавалі.

**III. Знаёмства з гісторыяй паходжання свята.**

Можа хто з вас што ведае пра гэта свята? (*Адказы дзяцей).*

Вялікдзень — самае галоўнае хрысціянскае свята. У гэты дзень увесь праваслаўны свет адзначае Уваскрэсенне Ісуса Хрыста з мёртвых. У Ерусаліме Ісус быў укрыжаваны на крыжы, але на трэці дзень пасля смерці Ён уваскрэс. З таго часу ў гэты дзень усе праваслаўныя людзі святкуюць вялікае свята – Светлае Хрыстова Уваскрэсенне. Храмы ў гэты дзень упрыгожваюцца, святары апранаюць самыя прыгожыя ўборы, а вернікі стаяць з запаленымі свечкамі і чакаюць першых велікодных спеваў. Гэты Вялікі Дзень прыходзіць да нас яркім сонейкам, чыстым дажджом, светлай радасцю, надзеяй і верай у сілу дабра і кахання.

**IV. Знаёмства з традыцыямі і звычаямі святкавання Вялікадня.**

Існавала многа традыцый і звычаяў святкавання Вялікадня. Многія з іх захаваліся і да гэтага часу.

Да гэтага свята рыхтуюцца доўга: імкнуцца больш маліцца, не грубіяніць, быць паслухмянымі і адказнымі. Вялікі пост — час глыбокага смутку.

Вербная нядзеля — апошняя нядзеля перад Вялікаднем. У наш час амаль у кожнай сям'і да Вербнай нядзелі стаяць у хаце асвечаныя ў царкве галінкі вярбы. Са старажытных часоў існавала павер'е, што квітнеючае дрэва можа даць здароўе, сілу, прыгажосць усім, хто закране яго. У беларусаў гаючым, надзеле-

ным асаблівай сілай дрэвам лічыцца вярба. Быў такі звычай даўней — галінкамі вярбы выганяць жывёлу на першы выпас, змятаць вербным пучком павуцінне ў хатах. Гэтым як бы выганялі ўсё дрэннае з хаты, хваробы і няўдачы.

Маленькіх дзетак сцябалі галінкамі вярбы, каб яны былі здаровыя, ды прыгаворвалі пры гэтым: «Як вербачка расце, так і ты расці». А тых, хто старэй, сцябалі мацней, але таксама не балюча. Станавіцеся ў круг, я вас буду вербачкай сцябаць. *(Падыходзіць да кожнага, сцябае галінкай вярбы і прыгаворвае):*

*Вярба б'е, не я б'ю.*
*Сёння Вялікдзень,*
*Будзьце здаровы, як тая вярба,*
*Будзьце вясёлы, як тая вясна,*
*Будзьце багаты, як маці-зямля.*
*Слухайце бацькі,*
*Слухайце маці,*
*Не забывайце ўсім памагаці*
*Старэнькім, маленькім,*
*Ці хворым, можа,*
*А вам усім няхай*
*Бог дапаможа!*

Праваслаўная царква святкуе Вялікдзень асабліва ўрачыста. У гэты дзень ва ўсіх храмах звоняць званы. Званіць у званы дазваляецца ўсім жадаючым, таму ў гэты дзень гучыць бесперапынны звон, падтрымліваючы радасны, святочны настрой. Праслухаеце велікодны Дабравест — святочны звон.

*Гучыць звон царкоўных званоў.*

А ці ведаеце вы якімі словамі вітаюць адзін аднаго ў свята Вялікадня?

На першай велікоднай службе вельмі часта гучыць вокліч святара: “Хрыстос уваскрос!” Пры гэтым усе павінны адказваць: “Сапраўды ўваскрос!” У гэтае свята ўсе праваслаўныя людзі дзеляцца адзін з адным радасцю і трохразова цалуюцца ў знак любові, хрыстосуюцца і пры гэтым прамаўляюць: “Хрыстос уваскрос!”, — адказваючы: «Сапраўды ўваскрос!», — і дораць фарбаваныя яйкі. Асвячонае чырвонае яйка дораць блізкім і сябрам, пры гэтым людзі даруюць адзін аднаму ўсе крыўды, непаразуменні, а можа, і злосць. Як жа інакш, бо гэта радасны дзень Уваскрэсення. Давайце і мы з вамі павітаемся.

У гэтае свята існуе і такая традыцыя: прачнуўшыся раніцай, мылі твар вадой, у якой ляжала асвянцонае яйка. Лічылася, што такім чынам чалавек ачышчаецца ад усялякіх нягод. (*Выносіць таз з вадой, ставіць яго на стале).* Давайце і мы памыемся святой вадзіцай. А ў вадзічку мы пакладзём яйка чырвонае, каб здаровымі ўсе былі, прыгожымі, «краснымі». *(Дзеці падыходзяць да стала, мыюць твары, бабка прыгаворвае: Мыйце вочкі свае светлыя, тварыкі белыя, каб былі чыстыя, а шчочкі ружовыя, як яйкі; каб жыццё ваша было чыстым і празрыстым, як крынічка лясная. Дай вам Бог вырасці здаровенькімі ды працавітымі).*

Існуе яшчэ традыцыя — фарбаванне яек ў чырвоны колер. А ці ведаеце, вы чаму на Вялікдзень фарбуюць яйкі ў чырвоны колер? *(Адказы дзяцей).* А я вам зараз раскажу.

Пасля ўзнясення Ісус загадаў вучням ісці па свеце і прапаведаваць народу сваё вучэнне. Адправілася прапаведаваць вучэнне Хрыста і Марыя Магдаліна, якая шанавала Хрыста. Прыйшла яна ў Рым, у імператарскі палац. У тыя далёкія часы кожны, хто прыходзіў да імператара абавязкова прыносіў які-небудзь падарунак: багатыя — каштоўнасці, а бедныя — што маглі. У Марыі нічога з сабой не было, акрамя веры ў Хрыста. Працягнула яна імператару простае курынае яйка і адразу гучна вымавіла галоўную вестку: «Хрыстос уваскрос!». Здзівіўся імператар і сказаў: «Як можна паверыць у тое, што нехта можа ўваскрэснуць з мёртвых? Цяжка ў гэта паверыць, як і ў тое, што гэтае белае яйка можа стаць чырвоным!» Пакуль ён гаварыў гэтыя словы, яйка стала мяняць свой колер: яно паружавела, пацямнела і, нарэшце, стала ярка-чырвоным. Чырвоны колер — колер крыві Хрыста.

Хачу вам нагадаць, што на Вялікдзень гатавалі багата страў. Як вы думаеце, а што людзі абавязкова ставяць на велікодны стол? *(Адказы дзяцей).*

Так, але пачыналі снедаць пасля таго, як кожны паспрабуе па кавалачку асвянцонага яйка, хлеба, солі.

Да нашых дзён захаваўся ў народзе звычай — на свята, пасля службы ў царкве, паабедаўшы дома, ідуць з віншаваннямі да сваіх блізкіх, да сяброў, нясуць у падарунак фарбаваныя яйкі і кулічы.

Дзеці, а як вы думаеце, навошта на Вялікдзень абменьваліся яйкамі? Не ведаеце? А затым, каб толькі дабро і святло прыставалі да душ нашых, каб усё благое, усё дрэннае, пад стаць шкарлупіне, у гэты дзень адстала. І вонкі змагло б прадзяўбнуцца толькі добрае, што ёсць у чалавеку.

А зараз мы з вамі адпачнём. Ведаеце, мае даражэнькія, у свята Вялікадня людзі не толькі хадзілі адзін да аднаго ў госці, але ўладкоўвалі велікодныя гульні. Галоўныя велікодныя забаўкі звязаны менавіта са святочнымі яйкамі. Яйкі катаюць з горкі ці па траве, б'юць адно аб другое вострым або тупым канцом, у іх нават кідаюць манеткамі.

Зараз і мы пагуляем у традыцыйныя велікодныя гульні. *(Пад народную музыку праводзяцца гульні для дзяцей).*

***«Ваўчок».*** Гульцы пачынаюць адначасова круціць на стале яйкі, чыё даўжэй пракруціцца, той і перамог.

***«Біткі».*** Удараюць яйкам аб яйка спачатку вострым канцом, а затым тупым. У каго яйка застанецца цэлым, той і перамог.

*А зараз пагуляйце,*
*Моц яек паспытайце.*
*Спачатку аб зубкі пастукайце,*
*Да вушка прыкладзіце – паслухайце:*
*Калі яйка гудзе, –*
*Значыць, моцным будзе,*
*А калі не, –*
*Значыць, нехта разаб'е.*

*(Дзеці гуляюць у біткі).*

***«Катанне яек».*** Латок або дошчачка кладзецца на край крэсла або стала, лаўкі, такім чынам, каб атрымалася «горка». Па камандзе ўдзельнікі павінны пракаціць яйка па горцы. Чыё яйка пакоціцца далей, той

і пераможца.

**V. Творчая дзейнасць вучняў.**

Ой-ой-ой, што ж гэта я загулялася з вамі, забавілася, а пра кулічы і забылася. Кажуць у народзе «У кожнай печы свой куліч». Як вы разумееце? (Адказы дзяцей). Сама я не ўпраўлюся, можа вы мне дапаможаце спячы кулічы? (*Адказы дзяцей).*

*Разгляданне кулічоў.*

Звярніце ўвагу на малюнкі. Усе кулічы розныя, кожная гаспадыня хацела спекчы і ўпрыгожыць так куліч, каб ён выдзяляўся сярод другіх: быў і смачнейшы і прыгажэйшы. Што выкарыстоўвала гаспадыня для ўпрыгожвання? *(Адказы дзяцей).*

Мы будзем рабіць аплікацыю. Усё неабходнае для работы ў вас на сталах.

*Складанне плана працы.*

Што зробім спачатку? *(Прылепім глазуру).* А потым прыступаем да ўпрыгожвання куліча. Трэба размясціць дэталі так, як мы іх будзем наклеіваць і наклеіць.

Самастойная работа навучэнцаў. (*Гучыць спакойная музыка.)*

У час самастойнай працы педагог аказвае індывідуальную дапамогу. Старэйшыя вучні дапамагаюць малодшым.

Выстава работ навучэнцаў.

Малайцы, кожны з вас пастараўся, у кожнага атрымаўся прыгожы куліч. Дзякуй за дапамогу.

**VI. Падагульненне занятку.**

Пра традыцыі і абрады якога свята мы сёння гаварылі? *(Адказы дзяцей).*

Гульня «Назаві велікоднае слова». Педагог прапануе назваць усе велікодныя словы, якія прагучалі на занятку.

**VII. Рэфлексія.**

Дзеці, калі вам на занятку было цікава, пакладзяце ў кошык чырвонае яйка, калі не — белае.

**VIII. Вынік.**

Свята Вялікадня чысціць душы людзей, робіць іх дабрэй. Давайце ў дні, што засталіся да Вялікадня, рабіць добрыя справы, не крыўдзіць адзін аднаго. І тады гэта вялікае свята прынясе вам сапраўдную радасць! Дзякуй за работу!

*Дата поступления в редакцию: 29.06.2023*

# ПЛАН-КОНСПЕКТ УРОКА ПО УЧЕБНОМУ ПРЕДМЕТУ «РУССКИЙ ЯЗЫК» В VI КЛАССЕ ПО ТЕМЕ «ПРАВОПИСАНИЕ *НЕ* С ИМЕНАМИ ПРИЛАГАТЕЛЬНЫМИ»

*Беляева Ольга Николаевна*

**Цель:** предполагается, что к концу урока обучающиеся научатся различать случаи слитного и раздельного написания не с именами прилагательными

**Задачи:**

обобщить, систематизировать знания учащихся о правописании не с именами прилагательными;

совершенствовать и закрепить навык правописания не с именами прилагательными;

совершенствовать аналитические, речевые и орфографические умения и навыки;

активизировать познавательную деятельность учащихся посредством использования заданий творческого характера;

развивать орфографическую зоркость и пунктуационную грамотность, словесно-логическое мышление, навык связной речи; содействовать развитию познавательных умений: воображения, памяти;

содействовать укреплению чувства гражданственности и патриотизма; средствами языка воспитывать интерес к живописи; организовать на уроке ситуации, содействующие развитию эстетического вкуса учащихся на основе межпредметных связей.

**Тип урока:** урок закрепления знаний, совершенствования умений и навыков.

**Методы и приемы:** репродуктивный, объяснительно-иллюстративный, проблемно-поисковый, словесно-наглядный, беседа, метод творческого письма.

**Формы работы:** фронтальная, парная, индивидуальная.

**Оборудование и дидактический материал:** учебники, репродукция картины В.К. Бялыницкого-Бирули «Вешние воды», звукозапись «Пение птиц в лесу», мультимедийная презентация, листы контроля.

**Ход урока**

**I. Ориентировочно-мотивационный этап.**

Задача: обеспечение мотивации учащихся.

Содержание этапа: приветственное слово учителя, направленное на мотивацию участников на совместную деятельность.

Деятельность учителя: организует знакомство с учащимися.

Деятельность учащихся: встраиваются в диалог,

[1]1. Белоголова, Т.В. Развитие творческих способностей на уроках русской литературы / Т.В. Белоголова // Русский язык и литература. — 2019. — №2. — 36 с.
2. Выготский, Л.С. Воображение и творчество в детском возрасте / Л.С. Выготский. — СПб.: Союз, 1997.
3. Никитин, Б.П. Способный ребенок не дар природы / Б.Н.Никитин. — М.: Просвещение, 1985.
4. Тырченкова, Л.И. Приемы развития познавательной и творческой деятельности обучающихся на уроках русского языка и литературы / Л.И. Тырченкова // Молодой ученый. — 2017. — №34. — 123–124 с.